ГАЗЕТА ВДУ ІМЯ П. М. МАШЭРАВА

# МЫ і ЧАС

№ 3 (351) ЧАЦВЕР, 26 САКАВІКА 2020 ГОДА

# ПРАЗ ПАМЯЦЬ, ПРАЗ СЛОВА





***Напярэдадні Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у нашым універсітэце ў сёмы раз прайшла традыцыйная гарадская акцыя «Праз дыялог моў – да душы, да сэрца».***



Ініцыятарам і арганізатарам мерапрыемства выступіў філалагічны факультэт пры падтрымцы абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў.

Сёлета дыктоўкі на рускай і беларускай мовах пісалі не толькі супрацоўнікі, выкладчыкі, студэнты ВДУ імя П.М. Машэрава, але і кіраўнікі прадпрыемстваў, ведамстваў, устаноў адукацыі і культуры, а таксама прадстаўнікі грамадзянскіх арганізацый Віцебска.

12 сакавіка, дзякуючы відэасувязі, усе жадаючыя пісалі дыктоўкі ў канферэнц-зале і аўдыторыях галоўнага корпуса нашага ўніверсітэта, а таксама ў іншых вучэбных карпусах – на факультэце сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі, педагагічным факультэце і факультэце фізічнай культуры і спорта. Паралельна трансляцыя праходзіла і для Аршанскага і Полацкага каледжаў ВДУ імя П.М. Машэрава.

Тэкст на рускай мове чытала рэктар універсітэта, доктар эканамічных навук, прафесар Валянціна Васільеўна Багатырова. На беларускай мове дыктаваў дэкан філалагічнага факультэта, доктар педагагічных навук Сяргей Уладзіміравіч Нікалаенка.

– У гэтым годзе мы вырашылі ўзяць урывак з рамана В. Быкава «Мёртвым не баліць» і невялікае апавяданне пра блакаду Ленінграда І. Табольскага «Памяць». Яны зусім розныя па змесце і эмацыянальнай афарбоўцы, але іх аб'ядноўвае галоўная думка пра непазбежную і доўгачаканую Перамогу нашага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, – адзначыў Сяргей Уладзіміравіч.

Падрабязней глядзіце ў сюжэце ТВУ з дапамогай Qr-кода.

**Вікторыя ЧАКУШКА.**
**Фота Алесі ДУБРОЎСКАЙ.**